Доктар адкажа

ПРЫШЧЭПКА АД ГЕПАТЫТУ В — НЕБЯСПЕЧНАЯ?

«УРАЧЫ пастаянна кажуць аб неабходнасці вакцынацыі дзяцей. Аднак я чула, што прышчэпкі ад гепатыту В істотна аслабляюць імунітэт немаўлят, а таксама эфект ад іншых прышчэпак... Ці так гэта?
Вольга, *г. Мінск*».

— Зараз у Беларусі ад гепатыту В прышчэпленыя каля 200 тысяч дзяцей, — кажа ***загадчыца аддзялення імунапрафілактыкі Рэспубліканскага цэнтра гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя Вераніка ШЫМАНОВІЧ.*** *— Такая прышчэпка сёння выконваецца ва ўсім свеце. З 2000 года яна робіцца ўсім нованароджаным і ў Беларусі — на працягу першых 24-х гадзін жыцця. Акрамя таго, у нас ёсць і катэгорыя 13-гадовых, якім таксама выконваецца вакцынацыя супраць гепатыту В. У 2014 годзе ў нас ужо не будзе падлеткаў, якім трэба рабіць падобную вакцынацыю. Тады мы будзем прышчэпліваць толькі немаўлят. Зараз мы ахопліваем 97 працэнтаў усіх народжаных, што з'яўляецца вельмі добрым паказчыкам.*

Прышчэпка не выклікае ніякіх ускладненняў і не павінна выклікаць апасенняў, паколькі вырабляецца і выкарыстоўваецца ў іншых краінах даволі даўно. Між тым, гепатыт В сёння лічыцца вельмі распаўсюджанай інфекцыяй і наносіць непапраўную шкоду здароўю чалавека. Захворванне перадаецца як парантэральным шляхам — праз кроў, так і шляхам палавым. Рызыка перадачы інфекцыі захоўваецца нават у касметычных і стаматалагічных кабінетах, а таксама ў хатніх умовах — напрыклад, пры выкарыстанні чужой брытвы.

Што датычыць дарослых, якія не прышчэпліваліся ў дзяцінстве, але маюць намер прайсці вакцынацыю, то гэтым пытаннем трэба пацікавіцца ў паліклініцы па месцы жыхарства. Мінчанам можна звяртацца адразу ў Гарадскі цэнтр імунапрафілактыкі, што на базе Мінскай гарадской дзіцячай клінічнай інфекцыйнай бальніцы. У абавязковым парадку прышчэпку ад гепатыту В атрымліваюць зараз усе медыцынскія работнікі...

Вакцынацыя — ратаванне ад эпідэмій

Да ўвядзення планавай імунізацыі дзяцей інфекцыйныя хваробы з'яўляліся асноўнай прычынай дзіцячай смяротнасці, а эпідэміі здараліся досыць часта. Вакцынапрафілактыка змяніла гэтую сітуацыю. Захворванасць на тыя інфекцыі, у дачыненні да якіх праводзіцца вакцынацыя, істотна знізілася, амаль да ліквідацыі некаторых з іх.

Першай інфекцыяй, якую ўдалося ліквідаваць з дапамогай вакцынацыі, стала натуральная воспа. У давакцынальны час воспа штогод забірала 5 млн жыццяў. Пачынаючы з 1978 года, натуральная воспа нідзе не рэгіструецца.

Яшчэ адна вельмі цяжкая дзіцячая інфекцыя — поліяміэліт, якая прыводзіць практычна да пажыццёвай інваліднасці, сёння таксама не рэгіструецца ў абсалютнай большасці краін свету. Еўрапейскі рэгіён аб'яўлены свабодным ад поліяміэліту ў 2002 годзе.

Мяркуецца, што ў бліжэйшай будучыні ўдасца ліквідаваць і іншыя інфекцыі. У еўрапейскім рэгіёне пастаўлена мэта перамагчы адзёр і краснуху.

Згодна з нацыянальным календаром прышчэпак, у Беларусі ажыццяўляецца планавая вакцынацыя супраць поліяміэліту, дыфтэрыі, коклюшу, слупняку, адру, краснухі, паратыту, гепатыту В і туберкулёзу. Акрамя таго, па эпідэміялагічных паказаннях праводзіцца вакцынацыя супраць цэлага шэрагу інфекцыйных захворванняў — грыпу, клешчавага энцэфаліту, гепатыту А і інш. Дзякуючы высокаму ахопу насельніцтва планавай вакцынацыяй у краіне дасягнуты вялікія поспехі ў барацьбе з інфекцыямі. Істотна знізілася захваральнасць на паратыт і гепатыт В. Выяўляюцца адзінкавыя выпадкі дыфтэрыі, адру і краснухі ў год.

Аднак праблема інфекцыйных захворванняў — гэта праблема заўсёды міжнародная. Інфекцыйныя агенты лёгка перасякаюць межы і распаўсюджваюцца з адной краіны ў іншую. Імпартаванне інфекцый з краіны ў краіну і нават з аднаго рэгіёну свету ў іншы сёння здараецца даволі часта. З гэтай праблемай наша краіна сутыкнулася ў 2006 г., калі пасля працяглага зацішша зноў пачалі рэгістравацца выпадкі адру. Усяго на працягу 2011 года было зарэгістравана 50 выпадкаў адру, і ўсе яны былі завезены з-за мяжы.

Таму вельмі важна пастаянна падтрымліваць высокі ўзровень ахопу прышчэпкамі, што дазволіць забяспечыць высокі ўзровень імунітэту ў папуляцыі. У Беларусі ахоп прышчэпкамі супраць інфекцый досыць высокі — 97 працэнтаў і вышэй. Аднак у цэлым па еўрапейскім рэгіёне ахоп прышчэпкамі складае ў сярэднім 90 працэнтаў, што усё ж такі не з'яўляецца аптымальным. У некаторых краінах па асобных інфекцыях ён нават ніжэй за 90 працэнтаў.

У параўнанні з іншымі рэгіёнамі ў Еўропе адзін з найбольш нізкіх узроўняў захваральнасці на тыя інфекцыі, якія можна папярэдзіць з дапамогай вакцынацыі. Аднак, паводле разлікаў Сусветнай арганізацыі аховы здароўя, у еўрапейскім рэгіёне па віне хвароб, якіх можна было пазбегнуць з дапамогай вакцынацыі, штогод памірае 32 тыс. дзяцей.

Імунізацыя — адна з тых рэдкіх паслуг, якая каштуе няшмат, але дае пры гэтым вялікую карысць для здароўя і дабрабыту ўсяго насельніцтва.

Святлана БАРЫСЕНКА.

РЫБАКІ ВЫЙШЛІ НА НЕТРЫВАЛЫ ЛЁД...

ЗА мінулыя выхадныя ў краіне некалькі разоў ратавалі людзей, што праваліліся пад лёд.

— У суботу ў 14.15 відавочцы патэлефанавалі сталічным выратавальнікам: на Чыжоўскім вадасховішчы тонуць два чалавекі, — распавёў «Звяздзе» старшы **інспектар Цэнтра даследаванняў у галіне бяспекі жыццядзейнасці Міністэрства па надзвычайных сітуацыях Алег Малевіч.** — Два рыбакі знаходзіліся за 50 метраў ад берага ў палонцы памерам 1х2 метры. Мужчын — а гэта былі бацька з сынам (адпаведна, 1952 і 1977 гадоў нараджэння) — выратавалі і перадалі медыкам. Пасля агляду пацярпелых даставілі дадому.

У нядзелю а палове 12 гадзіны работнікам МНС давялося ратаваць мужчыну, які праваліўся пад лёд на возеры Белае паблізу вёскі Гатовічы Мядзельскага раёна.

— За крыху больш чым 10 хвілін нештатная вадалазна-выратавальная група Мядзельскага раённага аддзела па надзвычайных сітуацыях пераадолела 14 кіламетраў. Медыкі ўжо чакалі на беразе, — паведаміла рэдакцыі **старшы інспектар цэнтра прапаганды і навучання пры Мінскім абласным упраўленні МНС Дыяна Жалязняк.** — Чалавек знаходзіўся за 120 метраў ад берага. Паколькі знаходжанне на лёдзе групы людзей было рызыкоўным, начальнік дзяжурнай змены малодшы лейтэнант унутранай службы Аляксандр Купрэвіч вырашыў дзейнічаць адзін. Яго прафесіяналізм і рашучасць далі плён: чалавек быў выратаваны і з дыягназам «агульнае пераахаладжэнне» дастаўлены ў рэанімацыйнае аддзяленне Мядзельскай цэнтральнай раённай бальніцы.

Як расказалі іншыя рыбакі, сведкі здарэння, пацярпелы пэўны час спакойна лавіў рыбу, пакуль не вырашыў змяніць месца. І зайшоў занадта далёка...

Міністэрства па надзвычайных сітуацыях нагадвае: зараз з-за нестабільнага тэмпературнага рэжыму, наяўнасці цячэнняў і іншых фактараў лёд на вадаёмах у некаторых месцах недастаткова трывалы. Будзьце пільнымі!

Сяргей РАСОЛЬКА.

СЁННЯ

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	9.10	17.34	8.24
Віцебск —	9.05	17.18	8.13
Магілёў —	9.00	17.24	8.24
Гомель —	8.50	17.27	8.37
Гродна —	9.24	17.50	8.26
Брэст —	9.18	17.57	8.39

Месяц

Маладзік 23 студзеня. Месяц у сузор'і Вадалея.

Імяніны

Пр. *Мікалая, Міхаіла, Уладзіміра, Фёдара.*

К. *Мілены, Феліцыі, Эрыкі, Рафала, Роберта, Фелікса, Францішка, Цімафея.*

Фота Марыі ЖЫЛІНСКАЙ.

НАДВОР'Е на заўтра



Дзве даты

24 студзеня

1895 год — у Мінску ўведзена ў дзеянне першая электрастанцыя. Найбуйнейшая ў Беларусі з ліку муніцыпальных. Знаходзілася на правым беразе Свіслачы, побач з сучасным будынкам Беларускага дзяржаўнага цырка. Увод гэтай электрастанцыі дазволіў усталяваць у горадзе 390 лямпачак напальвання: 140 для асвятлення вуліц Петрапаўлаўскай, Праабражэнскай, Губернатарскай, Захар'еўскай, 140 у зімовым і летнім тэатрах і 110 у прыватных спажыўцоў. Гараджане хутка ацанілі перавагу новага віду асвятлення, і ўжо праз тры гады горад меў 1100 лямпачак напальвання ў 16 свечак: 240 — на вуліцах, 420 — у тэатрах і 430 — у прыватным спажыванні. Пасля 1905 года з'явіліся і першыя электралямпы вольтавай дугі. Яны перыядычна запальваліся ў тэатры, цырку, на гуляннях.

1848 год — нейкі Джэймс Маршал, які працаваў на лесапільні ў Каліфорніі, знайшоў залаты злітак. Гэта паслужыла пачаткам «залатой ліхаманкі», так яскрава пазней апісанай у прыгодніцкай літаратуры і паказанай у вестэрнах. Тысячы людзей з усіх канцоў Амерыкі, а затым і ўсяго свету рынуліся ў Каліфорнію на пошукі золата. Некаторыя з іх сталі мільянерамі, але большасць згалела. Каліфорнія спачатку прыйшла ў заняпад — усе дарослыя мужчыны кінулі сваю працу. З-за гэтага, у прыватнасці, разарылася лесапільня, на якой працаваў той самы Джэймс Маршал. Нават Сан-Францыска цалкам апусцеў. Аднак прайшоў час, і каліфарнійскія гарады расквітнелі дзякуючы велізарнаму прытоку насельніцтва. Няўдачлівыя золаташукальнікі аказаліся таннай рабочай сілай для мясцовых прадпрыемстваў, а тыя, хто ўсё-ткі знайшоў золата, укладвалі яго ў мясцовую эканоміку. Пачалося ператварэнне Каліфорніі ў штат мільянераў. Але гэта было потым, а сціплы рабочы Джэймс Маршал, які мімаволі запусціў увесь гэты працэс, памёр у трухлявай хаціне. Сёння яму пастаўлены помнік у тым месцы, дзе быў знойдзены першы самародак.

Цытата дня

«Не трэба баяцца з жыццём паспрачацца і праўду сваю даказаць».
Аркадзь Чарнушэвіч (1912—1967), беларускі пісьменнік.

На ўзлеску — міны

Ля вёскі Дуброва Светлагорскага раёна меліяратары натрапілі на склад боепрыпасаў. Першапачаткова ў лясным масіве была знойдзена адна мінамётная міна, пра што паступіла інфармацыя ў раённую міліцыю. Пасля дадатковага абследавання тэрыторыі выяўлена яшчэ 56 узрывальнікаў і 42 міны калібру 82 мм часоў Вялікай Айчыннай вайны. Усе боепрыпасы савецкай і нямецкай вытворчасці добра захаваліся, таму ўяўлялі вялікую небяспеку. Сапёры вайсковай часці 5527 прынялі рашэнне: знішчыць іх на месцы. Агульная вага выбуховага рэчыва ў трацілавым эквіваленце склала амаль 17 кг.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

Усміхнемся!

— Ці ёсць разумнае жыццё ў сусвеце?

— Ёсць.

— А чаму з намі не звязваецца?

— Дык разумнае ж...

☺

Як праходзіць тыдзень: панядзеееееелак.... аўтоооорак.... серадаааааааа.... чацвееееееер.... пятніцасуботанядзеля.

☺

Калі ёй было 3 гадкі, яна бегала галышом па пляжы. Цяпер ёй 33, але пара бутэлек шампанскага дапамагае ёй вярнуцца ў дзяцінства.

☺

— У мяне ў ваннай з крана цячэ вада.

— А павінна што?

— Каньяк.

— Чаму гэта?

— Мяркуючы па «плацёжцы» за студзень...